Очередной причиной, разрушившей не одну мирную инициативу, является нерешённость наиболее острых вопросов конфликта. Это во многом предопределило крах «Соглашений Осло». Дело в том, что в этих инициативах не только не прописывались механизмы разрешения наиболее сложных проблем палестино-израильского конфликта, но и не предлагались даже какие-либо «промежуточные» шаги, которые могли бы, в случае их реализации, создать модели для поэтапного движения к урегулированию на следующих стадиях [3, с. 20]. Следует отметить, что эти планы принципиально отличаются друг от друга. Так, в «Дорожной карте» ничего не говорится ни о проблеме Иерусалима, ни и о проблеме беженцев. В сущности, «Дорожная карта» повторяет ту же ошибку, которая привела к краху «процесса Осло». В обоих случаях о самых важных проблемах не сказано ничего, их решение откладывается на неопределенный срок [4, с. 23–24].

Следующей причиной являются разногласия внутри «Квартета». Дело в том, что полноценное сотрудничество и равная вовлеченность США, ЕС, России и ООН в ходе реализации инициативы представляются спорными. Сама по себе идея «Квартета», который заставит играть вместе, с одной стороны, США и ЕС, а с другой – ООН и Россию, вполне легитимна и в идеале могла бы положить конец истории конкурирующих планов мирного урегулирования. Однако опыт предыдущих лет показывает, что подобная идиллия практически не достижима из-за разного политического потенциала и авторитета. По сути, противоречия между посредниками были перенесены с уровня дискуссий в международных организациях на уровень споров внутри «Квартета», что с неизбежностью приводит к внутреннему дисбалансу посреднического механизма [1, с. 99–100].

**Заключение.** Таким образом, основными причинами невыполнения плана «Дорожная карта» по мирному урегулированию палестино-израильской проблемы являлись: 1) сложная обстановка в регионе; 2) приход к власти в Палестинской национальной автономии экстремистского исламского движения ХАМАС; 3) сжатые сроки реализации «Дорожной карты»; 4) нерешённость наиболее острых вопросов конфликта, таких как статус беженцев и проблема Иерусалима; 5) разногласия внутри «Квартета».

Следует отметить, что «Дорожная карта» не имела шансов на успех. Дело в том, что изначально были допущены серьёзные ошибки в плане проведения данной мирной инициативы.

1. Федорченко, А.В. Израиль в начале XXI века / А.В. Федорченко, О.А. Зайцева, Д.А. Марьясис. – М.: Институт изучения Израиля и Ближнего Востока, 2004. – 344 с.
2. Бакланов, А.Г. Ближний восток: «Дорожная карта» региональной безопасности / А.Г. Бакланов. – М.: Институт Ближнего Востока, 2006. – 135 с.
3. Эпштейн, А.Д. Почему провалилась «Дорожная карта»? / А.Д. Эпштейн. – М.: Институт Ближнего Востока, 2006. – 129 с.
4. Программы урегулирования палестино-израильского конфликта: три года после переговоров в Кэмп-Дэвиде и Табе / А.Д. Эпштейн, Й. Альпер [и др.]; под ред. А.Д. Эпштейна. – М.: Институт изучения Израиля и Ближнего Востока, 2004. – 184 с.

## ЗАПІСЫ АБ ЦУДАХ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА (ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА Ў БЕЛАРУСІ)

***Сыцько К.В.***
*аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Доўнар А.Б., канд. гіст. навук*

Рыма-каталіцызм, як і іншыя хрысціянскія канфесіі, адыграў важную ролю ў станаўленні духоўнай культуры Беларусі. Адным з цікавых аспектаў гэтай культуры з’яўляецца вера ў цуды – звышнатуральныя падзеі, якія не могуць быць растлумачаныя і здзяйсняюцца Gratiam Dei. Дадзеная грань народнага хрысціянства настолькі шчыльна ўлілася ў светаўспрыманне пэўнай часткі соцыума, што нават на сённяшні момант, у эпоху паўсямеснай секулярызацыі жыцця, звесткі аб цудах працягваюць натавацца ў адмысловых кнігах.

Мэтай даследавання з’яўляецца структурны аналіз гістарычных запісаў аб цудах у некаторых парафіях Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Асноўным матэрыялам дадзенага даследавання з’яўляюцца запісы аб здзяйсненні цудаў у шэрагу сакральных месцаў – Санктуарыі Езуса Журботнага ў Росі, капліцы Узвышэння Святога Крыжа ў Цвермах і інш. Аўтарам выкарыстоўваліся як уласнагістарычныя метады даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны), так і нетрадыцыйныя метады, такія, як тэкставы аналіз, структурны аналіз і г. д.



Репозиторий ВГУ

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Захаванне звестак аб цудах заўжды з'яўлялася важным аспектам функцыянавання хрысціянскай царквы, незалежна ад канфесіі, перыяду, сацыяльных, ідэалагічных і іншых умоў. Ян Хрызастом, прылічаны Папам Рымскім Піем IV да ліку Настаўнікаў Царквы, адзначаў, што цуды здзяйсняліся з мэтай умацавання сярод прадстаўнікоў грамадства веры [1, с. 452]. Гэта абазначае, што запіс аб здзяйсненні звышнатуральнай падзеі неабходна было занатаваць для як мага больш эфектыўнага распаўсюду звестак аб гэтым.

Практычна ў кожнай парафіі былі пэўныя сакральныя прадметы, якія, паводле ўяўленняў парафіян, здзяйснялі цуды. Парафіяльныя архівы Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі захавалі шэраг кніг за XVII – першую палову XX стст., у якіх дадзеныя цуды запісаныя. Памянёныя кнігі з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння мікрагісторыі, гісторыі штодзённасці і г. д. У працэсе даследавання дадзеных матэрыялаў выявілася, што запіс аб цудзе мае некалькі трафарэтны характар, незалежна ад дэканату і парафіі, у якой знаходзіцца сакральны прадмет. Так, у кожным запісе можна выдзеліць некалькі абавязковых частак – своеасаблівых інфармацыйных палёў, якія адыгрываюць важную ролю ў пабудове структуры крыніцы: палі часу, асобы, лакацыі, праблемы і вырашэння праблемы.

Інфармацыйнае поле часу з'яўляецца кропкай на храналагічнай шкале, у якой адбываецца падзея. Аналіз колькасных адносін дадзеных кропак па перыядах дазваляе зразумець, у які час у пэўнай лакацыі адбывалася павышэнне, або паніжэнне ўзроўню рэлігійнасці, а таксама дазваляе вызначыць кантэкст гэтых зрушанняў. У прыватнасці, у Росі [2], Навагрудку [3] і шмат інш., калі верыць крыніцам, цуды адбываліся з сістэмнай перыядычнасцю, а ў Цвермскай капліцы да 1929 г. занатавана толькі адно цуда – ў 1772 г. Пасля таго, як капліцу пачаў адбудоўваць кс. Гіпаліт Баярунец (які, калі верыць гістарычным дакументам, быў вельмі адданай сваёй справе асобай), з 1929 па 1935 гг., паводле запісаў, здарылася шэсць цудаў [4, арк. 14 – 14адв.]. Гэта паказвае, наколькі важны фактар асобы святара, яго асабістыя ўсталёўкі, харызматычнасць і інш. у рэлігійных уяўленнях грамадства.

Інфармацыйнае поле асобы. З дапамогай гэтага кантэкстуальнага поля аналізуецца сацыяльны склад людзей, з якімі здараліся надзвычайныя падзеі. Як паказвае даследаванне дасяжых аўтару запісаў аб цудах, паходжанне просьбіта ўказвалася ў абавязковым парадку. Таксама можна адзначыць, што "ласкі" нярэдка здараліся з цэлымі сем'ямі. Напрыклад, у 1736 г. у Росі, пасля ўскладання да фігуры Езуса Журботнага воты, паводле кнігі цудаў, быў вылечаны ад хваробы шляхціц Анджэй Брадоўскі, у 1740 г. – яго адзіная дачка [2, арк. 3] і шмат інш.

Інфармацыйнае поле лакацыі. У запісах аб цудах абавязковым з'яўляецца абрыс мясцовасці, адкуль прыбыла асоба, якая хоча пакланіцца цудадзейнаму крыжу, фігуры, абразу і г. д. Гэта дазваляе аналізаваць маштаб важнасці сакральнага месца ва ўяўленнях тагачаснага соцыуму. Так, да фігуры Езуса Журботнага і іконы наваградскай Багародзіцы [3] з'язджаліся з дастаткова адлеглых ад дадзеных Санктуарыяў населеных пунктаў, а крыж у Цвермах з'яўляўся цудадзейнай святыняй толькі для жыхароў Лідскага дэканата, што можа гаварыць аб тым, што значнасць адных сакральных прадметаў была большай за значнасць іншых. У дадзеным выпадку ролю адыгрывае і тое, што цудадзейнасць наваградскага абраза і роскай фігуры была пацверджаная адмысловай камісіяй Віленскага біскупства, а цудадзейнасць крыжа ў Цвермах – не.

Інфармацыйнае поле праблемы. Хрысціяне звярталіся да сакральнага цудадзейнага прадмета з пэўнай праблемай, якую ён, па ўяўленнях вернікаў, у сілах вырашыць. Часцей за ўсё такою праблемай з'яўлялася хвароба. Аналіз дадзенага інфармацыйнага поля дазваляе зразумець, што хвалявала парафіян у пэўны адрэзак часу, моц іх рэлігійных уяўленняў (якія ў некаторых выпадках былі мацнейшымі за давер да медыцыны нават ў XX ст.). Так, 8 верасня 1930 г. Цвермскі крыж, паводле запісаў, вылечыў Францішака Жака, хоць дактары не маглі яму дапамагчы і лічылі, што Ф. Жак памрэ [4, арк. 14]. Просьба ажыццяўляецца з дапамогай пэўнага дзеяння – ўскладання воты, падвешвання ахвярнага фартушка і г. д.

Інфармацыйнае поле вырашэння праблемы. У абавязковым парадку ў кнігу цудаў занатоўваўся запіс аб тым, што просьба, з якою вернік звяртаўся да абраза, фігуры, крыжа, была выкананая. Дадзеная частка запісу аб цудзе з'яўлялася, трэба думаць, галоўнай, бо, як паказвае аналіз гістарычных крыніц, асобы маглі сведчыць пад прысягай, што менавіта з імі здараліся цудадзейныя з'явы.



Рэпазіторый ВДУ

У дадзеным выпадку паміж вырашэннем праблемы і ўласна праблемай усталёўваюцца адносіны перцінэнтнасці (адпаведнасці канчатковага выніку таму, што першапачаткова запытвалася). Такім чынам, дадзены запіс павышае веру ў цудадзейнасць сакральнага прадмета, бо ўсе просьбы, занатаваныя афіцыйна, выкананыя.

У сукупнасці пералічаныя вышэй элементы арганізоўваюцца ў цэльнае паведамленне, якое нясе каштоўныя гістарычныя звесткі аб асобе ў часе, яе рэлігійных і сацыяльных усталёўках. Як вынік, кніга цудаў будуецца такім чынам, што ў ёй змяшчаецца шмат скончаных паведамленняў, кожнае з якіх можа існаваць незалежна ад астатняга тэксту крыніцы, але адначасова ўзмацняецца пасродках іншага запісу аб цудзе.

Гэтыя запісы ў сукупнасці канцэнтруюць ўвагу на пэўным мікракосме – парафіяльнай святыні і жыцці вакол яе, што дазваляе называць кнігі цудаў каштоўнымі дакументамі па гісторыі невялікіх лакацый.

**Заключэнне.** Такім чынам, кнігі цудаў з’яўляюцца складанай крыніцай, якая пралівае святло на рэлігійныя светаўспрыманні прадстаўнікоў соцыуму пэўнага храналагічнага перыяду. Пры гэтым асобны запіс аб цудзе можна ўмоўна расчляніць на некалькі частак, кожная з якіх дае прадстаўленні аб лакальных, ідэалагічных, сацыяльных і іншых дэтэрмінантах, то бок праліць святло на тыя фактары, якія паўплывалі на памянёнае светаўспрыманне. Дадзеныя гістарычныя крыніцы з’яўляюцца каштоўным матэрыялам для даследаванняў у галіне мікрагісторыі, гісторыі парафіяльнай штодзённасці, гісторыі ментальнасці і г. д.

1. Творенія святаго отца нашего Іоанна Златоуста, архіепископа Константинопольскаго. – Кн. I. – СПб.: Санкт-Петербургская Духовная Академия, 1901. – 912 с.
2. Цэнтральны Навуковы архіў Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. – Ф. 3С. – Воп. 5. – Спр. 4.
3. Нікалаеў, М. В. Кніга цудаў Наваградскай іконы Багародзіцы як помнік гісторыі XVII стагоддзя. Даследаванне і тэкст / М. В. Мікалаеў // СПб. : б/в, 2015. – 126 с.
4. Цэнтральны Навуковы архіў Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. – Ф. 3С. – Воп. 4. – Спр. 10.

## ПРОБЛЕМА ИЕРУСАЛИМА: ИСТОРИЯ, СОВРЕМЕННОСТЬ, ПОПЫТКИ УРЕГУЛИРОВАНИЯ

***Тетерев В.А.***
*студент 4 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Величко Н.В., канд. ист. наук, доцент*

Вопрос об Иерусалиме занимает особое место в комплексе проблем ближневосточного урегулирования. Он вызывает настолько сильную эмоциональную реакцию у заинтересованных сторон, что исключает возможность рационального подхода к его обсуждению. В связи с этим иерусалимская проблема многие годы выводилась за рамки мирных инициатив по ближневосточному урегулированию.

Цель исследования – проследить основные этапы развития иерусалимской проблемы и выявить основные попытки её урегулирования международным сообществом.

**Материал и методы.** В ходе работы над темой исследования были привлечены находящиеся в открытом доступе резолюции и решения Генеральной Ассамблеи ООН (ГА ООН). Использовались такие общенаучные методы, как описание, анализ, синтез, а также историко-системный метод.

**Результаты и их обсуждение.** После прибытия первых евреев, выселяемых из европейских стран, сионистское движение сосредоточилось на создании поселенческих очагов в Иерусалиме. Первым из них стало поселение Ямин Моше, созданное в 1850 г. за пределами Старого Города. В 1858 г. там были созданы ещё два поселения. В старом Иерусалиме еврейское поселенческое присутствие не превышало 90 семей [1, с. 212].

В 1921 г. британские власти издали указ о пересмотре границы Старого Города. Его площадь была расширена на 7 км к западу. В границах города оказалась часть еврейских поселений. Еврейским поселенцам было разрешено превратить южную часть западной ограды мечети Аль-Акса (стену Аль-Бурака) в место поклонения, которое получило название Стена Плача. Ответом на это решение стало восстание 23 августа 1929 г. В результате была сформирована международная комиссия по определению прав мусульман и иудеев в отношении стены Аль-Бурака, которая высказалась в поддержку права арабов-мусульман на владение ею [1, с. 213].

Репозиторий ВГУ